

# ДЗЕВЯЦЬ САМЫХ ВАЖНЫХ СФЕР

**У Палацы Незалежнасці прайшло пасяджэнне Савета бяспекі**

(Падрабязнасці на 2–4 стар.)

РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

4 КРАСАВІКА 2025 г. ПЯТНІЦА № 66 (30454)

АБІТУРЫЕНТ-2025

## ФІЗІКІ, ЛІРЫКІ АБО... МЭТАВІКІ?

**План набору ў ВНУ захоўваецца на ўзроўні мінулага года, набяруць больш бюджэтнікаў, але філолагаў і псіхолагаў стане менш**



У Міністэрстве адукацыі Беларусі вызначылі план прыёму ва ўстановы вышэйшай адукацыі на бягучы год. У адукацыйным ведамстве падкрэслілі, што набор у ВНУ колькасна будзе такі ж, як і летась. План прыёму ў каледжы на 2025 год таксама сфарміраваны на ўзроўні плана прыёму 2024 года. Аб'ём і структура прыёму для падрыхтоўкі спецыялістаў па запатрабаваных эканомікай спецыяльнасцях скарэкціраваны. Іншымі словамі, універсітэты стануць менш рыхтаваць лірыкаў — філосафаў, сацыёлагаў, філолагаў, псіхолагаў, дыпламатаў, бізнес-адміністратараў, эколагаў, гісторыкаў і іншых, а падрыхтоўку фізікаў — спецыялістаў па дакладных навуках — павялічаць.

СТАР. 8–9



**+TV ПРАГРАМА**

«ЛЮБОЎ САВЕЦКАГА САЮЗА»



НА ПОЛІ ТАНКІ ГРУКАТАЛІ... 8–9



МЯНЯЕМ БАСАНОЖКІ НА ВАЛЁНКІ? 16

**Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!**

КАМУНАЛЬНЫЯ СТАСУНКІ

## ЛІКВІДАВАЦЬ ХАТНІ «ПАЛІГОН»

**Калі заварацць смеццеправоды?**



Заварыць усе смеццеправоды сталіцы адным рашэннем імгненна не атрымаецца, паведаміла генеральны дырэктар аб'яднання «Мінская гарадская жыллёвая гаспадарка» (МГЖГ) Марына ТОЎСЦІК. Яна адзначыла, што ў Год добраўпарадкавання асноўны акцэнт робіцца на дваровых тэрыторыях Мінска, якія змяняюцца з установкай новых кантэйнерных пляцовак.

— Гэта справа не аднаго года, — патлумачыла Марына Тоўсцік. — Але работа арганізавана ў адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам, гэта значыць, са згоды жыхароў.

СТАР. 7

ISSN 1990 — 763X

# ДЗЕВЯЦЬ САМЫХ ВАЖНЫХ СФЕР

## У Палацы Незалежнасці прайшло пасяджэнне Савета бяспекі



Фота БелТА.

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сабраў пасяджэнне Савета бяспекі. На разгляд вынесены Даклад аб стане нацыянальнай бяспекі і мерах па яе ўмацаванні. Адкрываючы пасяджэнне, беларускі лідар акрэсліў два асноўныя пытанні, вынесеныя на парадак дня. Першае — вынікі праведзенай работы па ацэнцы стану нацыянальнай бяспекі ў 2024 годзе. Другое — яго кіраўнік дзяржавы назваў самым важным — меры па ўмацаванні нацыянальнай бяспекі.**

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што парадак ацэнкі нацыянальнай бяспекі быў скарэкціраваны. Гэта знайшло адлюстраванне ў адпаведным указе. «З улікам дынамікі абстаноўкі, зацверджаных прыярытэтаў сацыяльна-эканамічнага развіцця ўдакладнены індыкатары, іх парогавыя значэнні, суб'екты дадзенага працэсу і іншыя пытанні. У сувязі з гэтым упершыню ў фармаце пасяджэння Савета бяспекі неабходна прадметна абмеркаваць абстаноўку ў кожнай з дзевяці сфер нацыянальнай бяспекі», — адзначыў Прэзідэнт. Згаданыя дзевяць сфер нацыянальнай бяспекі — гэта палітычная, эканамічная, навукова-тэхналагічная, сацыяльная, дэмаграфічная, біялагічная, інфармацыйная, ваенная, экалагічная. Указаныя пытанні ў поўным аб'ёме змяшчаюцца ў Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі, зацверджанай рашэннем Усебеларускага народнага сходу.

**«Канцэпцыя — найважнейшы дакумент стратэгічнага планавання, і ён закранае асноўныя інтарэсы людзей, іх жыццёвыя прыярытэты. У першую чаргу — гарантыі міру і бяспекі. І не толькі сёння, а ў будучыні», — падкрэсліў беларускі лідар.**

Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што ў некаторых краінах работа з дакументамі, якія раскрываюць сутнасць працэсаў, што адбываюцца ў краіне і свеце, глыбока засакрэчана. У пасяджэнні Савета бяспекі, акрамя членаў Савета бяспекі, прынялі ўдзел запрошаныя службовыя асобы, якія ў рамках сваёй кампетэнцыі адказваюць за канкрэтныя сферы нацыянальнай бяспекі, праводзяць маніторынг дынамікі па кожным індыкатары.

«З дакладам я азнаёміўся. Дакумент комплексны. Вы дадзіце яму сёння ацэнку. Хачу нацэліць прысутных на сур'ёзную ра-

# СТВОРАНЫ АПЕЛЯЦЫЙНЫ

## Судова-прававая рэформа краіны —

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 3 красавіка падпісаў Указ нумар 141 аб утварэнні Апеляцыйнага эканамічнага суда, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

**Гэта рашэнне прынята кіраўніком дзяржавы ў мэтах рэалізацыі палажэнняў Кодэкса грамадзянскага судаводства, якім прадугледжваецца стварэнне трохзвенавой сістэмы эканамічных судоў.**

**Такое структурнае пераўтварэнне адбудзецца за кошт падзелу дзейнасці судоў першай і апеляцыйнай інстанцый, якія цяпер функцыянуюць у рамках аднаго суда. Гэта стане важным крокам у кірунку павышэння эфектыўнасці ажыццяўлення правасуддзя па эканамічных справах.**

**Апеляцыйны эканамічны суд у статусе працэсуальнага органа пачне сваю работу з 1 студзеня 2026 года, гэта значыць, з даты ўступлення ў сілу Кодэкса грамадзянскага судаводства.**

**Суд плануецца сфарміраваць за кошт наяўнай колькасці суддзяў і работнікаў апаратаў іншых судоў. Усяго ўім будуць працаваць 27 суддзяў, у тым ліку старшыня і яго намеснікі. Вярхоўнаму Суду даручана ўнесці прапановы па кандыдатурах на кіруючыя і судзейскія пасады, а таксама вырашыць усе неабходныя арганізацыйныя пытанні, накіраваныя на забеспячэнне дзейнасці новага судовага органа.**

Як адзначыў **намеснік Старшыні Вярхоўнага Суда Юрый КОБЕЦ,** каментуючы падпісаны Прэзідэнтам указ, уступленне ў сілу 1 студзеня 2026 года асноўных палажэнняў Кодэкса грамадзянскага судаводства стане адным з завяршальных этапаў судова-прававой рэформы Рэспублікі Беларусь. Гэта рэформа прадугледжвае стварэнне Апеляцыйнага эканамічнага суда.

«Эканамічныя суды ўпершыню ў сваёй гісторыі будуць працаваць у трохзвенавой сістэме, — канкрэтызаваў намеснік Старшыні Вярхоўнага Суда. — Пры гэтым эканамічныя суды абласцей і эканамічны суд горада Мінска будуць выступаць у якасці судоў першай інстанцыі, а новы апеляцыйны — у якасці другой, апеляцыйнай, інстанцыі. Пры гэтым Апеляцыйны эканамічны суд будзе працаваць у складзе 27 суддзяў, уключаючы старшыню і двух яго намеснікаў».

Што датычыцца камплектавання Апеляцыйнага эканамічнага суда, Юрый Кобец праінфармаваў, што яно будзе адбывацца выключна за кошт кадраў сістэмы судоў агульнай юрысдыкцыі. «Ні адной дадатковай адзінкі — ні суддзяў, ні дзяржаўных служачых, ні супрацоўнікаў апарату суда — мы ў гэты суд не бяром», — удакладніў ён.

У апеляцыйным судзе плануецца стварыць Прэзідыум, калегію па разглядзе апеляцыйных скаргаў і судовую калегію па разглядзе спраў па правілах суда першай інстанцыі і справах аб адміністрацыйных правапарушэннях. Да кампетэнцыі апеляцыйнага суда, па словах намесніка Старшыні Вярхоўнага Суда, будзе адносіцца разгляд грамадзянскіх спраў па эканамічных спрэчках, якія выцякаюць з гаспадарчых праваадносін, а таксама нагляд за дзейнасцю ніжэйшых абласных эканамічных судоў і эканамічнага суда горада Мінска.

Будынак Апеляцыйнага эканамічнага суда — на стадыі ўзвядзення. Ён будзе размяшчацца па вуліцы Мяснікова, 5. У сучасным будынку прадугледжаны зала Прэзідыума, восем залаў судовых пасяджэнняў — створаны ўсе ўмовы для добрай работы.

«Стварэнне Апеляцыйнага эканамічнага суда перш за ўсё прадыктавана неабходнасцю забяспечыць больш аператыўнае і якаснае ажыццяўленне эканамічнага правасуддзя, — падкрэсліў Юрый Кобец. — Са стварэннем апеляцыйнага суда мы адразу вырашаем некалькі задач. Першая задача — вылучэнне апеляцыйнай інстанцыі з эканамічных судоў абласцей і горада Мінска. У цяперашні час дзве інстанцыі знаходзяцца ў адным судзе, што з'яўляецца не зусім правільным і выклікае дастаткова абгрунтаваныя нараканні з боку ўдзельнікаў працэсу. Паколькі атрымліваецца, што тыя ж самыя суддзі, якія працуюць у судзе першай інстанцыі, і суддзі апеляцыйнай інстанцыі, якія працуюць у тым жа судзе, займаюцца разглядам адных і тых жа спрэчак, што, натуральна, у пэўнай ступені нараджае незадавальненне вынікамі такога разгляду спраў».

**Генеральны дырэктар ААТ «Беларускі цэментны завод», член Савета Рэспублікі Ігар СЯРГЕЕЎ** адзначае: «Цяпер у судовай

боту. Непасрэдна ад кожнага з вас пачуць рэальную ацэнку сітуацыі. Выразна і аб'ектыўна далажыце аб праблемах, якія ёсць.

**Усе пытанні, што сёння будуць абмяркоўвацца, мы павінны абавязкова ўлічыць пры падрыхтоўцы Паслання Прэзідэнта Беларусі да беларускага народа і Нацыянальнага сходу. Вельмі важна выказацца, хто дзе не згодны, дзе яшчэ ёсць вузкія месцы і, самае галоўнае, што яшчэ трэба зрабіць, каб гэтыя праблемы вырашыць», — задаў тон пасяджэння кіраўнік дзяржавы.**

## ПАТРАБАВАННЕ ПРЭЗІДЭНТА — САМАЗАСПАКОЙВАЦЦА НЕ ТРЭБА



Большая частка пасяджэння прайшла ў закрытым ад журналістаў фармаце. Але пасля мерапрыемства Дзяржаўны сакратар Савета бяспекі Аляксандр Вальфовіч расказаў прадстаўнікам СМІ некаторыя дэталі. Па яго словах, на пасяджэнні, якое прайшло ў новым фармаце, былі прадметна абмеркаваны кожная з дзевяці сфер нацыянальнай бяспекі. Дзяржаўны сакратар падкрэсліў, што такі фармат пасяджэння Савета бяспекі вельмі карысны. Бо ўсе члены Савета бяспекі, службовыя асобы адказныя за кожную з дзевяці сфер нацыянальнай бяспекі, павінны не толькі ведаць, што адбываецца, але і разумець, якія меры трэба прымаць для таго, каб супрацьстаяць выклікам і пагрозам у кожнай сферы.

Упершыню ў такім фармаце разглядалася і дабаўленая ў мінулым годзе сфера біялагічнай бяспекі. «Гэта сфера мае стабільныя паказчыкі па ўсіх індыкатарах нацыянальнай бяспекі і не выклікае асцярогі, але, тым не менш, на пытанні біялагічнай бяспекі не звяртаць увагі нельга. На гэта паказвае абстаноўка, якая складваецца ў свеце», — адзначыў Аляксандр Вальфовіч.

«У цэлым абстаноўка ацэньваецца станоўча. Вядома ж, ёсць моманты, ёсць некаторыя напрамкі, якія не зусім залежаць ад дзейнасці Прэзідэнта нашай краіны, ад кіраўніцтва і членаў Савета бяспекі. Ёсць фактары, якія стаяць над намі. Найперш напружвае знешнепалітычная абстаноўка з тэндэнцыямі да абвастрэння», — адзначыў Аляксандр Вальфовіч. Ён прывёў вядомы прыклад: заходнія суседзі палякі і прыбалты недалёка ад нашых граніц мілітарызуюцца, узмацняюць агрэсіўную рыторыку. «Літаральна нядаўна атрымана інфармацыя аб тым, што ў раёне Сувалкаўскага калідора палякі разгортваюць новыя аператыўныя часткі, разведвальныя батальёны, сцягваюць туды тэхніку — спрабуюць абараніцца ад уяўнай пагрозы з усходу. Але гэта выглядае смешна, таму што Узброеныя сілы, ваенная арганізацыя дзяржавы не робіць стаўку на павелічэнне ваенных бюджэтаў, павелічэнне колькасці вучэнняў», — заявіў Дзяржаўны сакратар Савета бяспекі.

На эканамічную сферу нацыянальнай бяспекі ўплываюць санкцыі. «Аднак эканоміка ўстойліва развіваецца, ідзе наперад. Забяспечана самае галоўнае — макраэканамічная збалансаванасць. Тэмпы росту эканомікі вышэйшыя за агульнасусветныя. Сітуацыя на валютным і дэпазітным рынку таксама стабільная. У краіне зроблена шмат, але патрабаванне Прэзідэнта — самазаспакойвацца не трэба», — адзначыў Аляксандр Вальфовіч. Нягледзячы на стабільнае развіццё навукова-тэхналагічнай сферы, трэба ўмацаваць работу ў гэтым кірунку. Бо, як заўважыў Дзяржаўны сакратар Савета бяспекі, сёння развіццё краіны без навукі немагчыма. Па словах Аляксандра Вальфовіча, падпісаны на гэтым тыдні Прэзідэнтам указ аб прыярытэтных кірунках навуковай, навукова-тэхнічнай і інавацыйнай дзейнасці на 2026—2030 гады сведчыць аб тым, што ўрад бачыць існуючыя праблемы і прымае меры для развіцця тэхналогій.

Праблемай не толькі для нашай краіны, але і для шэрагу еўрапейскіх дзяржаў застаецца дэмаграфія. «Нараджальнасць практычна ва ўсіх еўрапейскіх дзяржавах ніжэйшая за парогавае значэнне, а смяротнасць збольшага перавышае нараджальнасць. Пра гэта гавораць і тыя дэмаграфічныя ямы 1990-х — пачатку 2000-х гадоў, што звязана перш за ўсё з развалам Савецкага Саюза, калі людзі жылі ў невядомасці і нараджальнасць была нізкай. Але з улікам таго, што робіцца ў нашай краіне, нават у параўнанні з Еўропай, тых выпрацаваных праграм, мы далёка наперадзе еўрапейскіх дзяржаў. Беларусь ведае гэту праблему, думае аб гэтай праблеме. Яна хвалюе і Прэзідэнта, і ўрад. У гэтым кірунку работа вядзецца», — заявіў Аляксандр Вальфовіч. Ён выказаў спадзяванне, што ўсе меры, якія прымаюцца ў Беларусі для вырашэння дэмаграфічнай праблемы, у хуткім часе дадуць свой станоўчы вынік.

«Па кожнай сферы нацыянальнай бяспекі былі дадзены канкрэтныя даручэнні, каб мы нарошчвалі работу і забяспечылі той мір, тую бяспеку, якая сёння ёсць у нашай краіне. Усё павінна быць накіравана на стварэнне яшчэ лепшых умоў для жыцця і працы нашых грамадзян. Але і ад грамадзян таксама павінна быць аддача. Гарантыі дзяржава дае, але грамадзяне павінны працаваць і даваць вынік на карысць нашай краіны», — падсумаваў Аляксандр Вальфовіч.

**Варта нагадаць, якія індыкатары вызначаюць стан нацыянальнай бяспекі. Гэта доля валавога назапашвання асноўнага капіталу; ступень уліку норм міжнароднага права і прадугледжаных у ім палітыка-прававых механізмаў у вырашэнні пытанняў, якія закранаюць інтарэсы суб'ектаў міжнародных адносін; наяўнасць і эфектыўнасць міжнародных прававых і палітыка-прававых гарантый бяспекі і суверэнітэту Беларусі. Таксама ў гэты спіс уключаны ўзровень даверу інстытутам дзяржаўнай улады; унутраныя выдаткі на навуковыя даследаванні і распрацоўкі; узровень развіцця інфармацыйных тэхналогій і тэлекамунікацый; стан ваенна-палітычнага становішча і шэраг іншых паказчыкаў.**

Журналісты пацікавіліся ў Дзяржаўнага сакратара Савета бяспекі, як сябе зарэкамендавалі гэтыя індыкатары, ці патрабуюць яны карэкціроўкі. Аляксандр Вальфовіч заўважыў, што калі раней акцэнт рабіўся на колькасныя паказчыкі, то цяпер — на якасныя. Стан нацыянальнай бяспекі па гэтых індыкатарах ацэньваўся ўпершыню. Па словах Дзяржсакратара, пакуль ніякай карэкціроўкі яны не патрабуюць.

Аляксандр Вальфовіч таксама расказаў, што пры выпрацоўцы гэтых паказчыкаў улічваўся досвед іншых краін. «Усе індыкатары маюць агульнасусветны характар, і мы не робім нейкіх паслабленняў для нашай краіны. Канешне, вельмі складана сёння трымаць удар, трымаць у цэлым стан нацыянальнай бяспекі на цяперашнім узроўні, — адзначыў ён. — Палітычны ціск на нашу краіну, эканамічныя санкцыі і агрэсіўная, мілітарыстычная скіраванасць нашых суседзяў, ды і Еўропы ўплываюць на стан нацыянальнай бяспекі. Натуральна, мы прадугледжваем контрмеры, і яны закладзены ў пастанове Савета бяспекі. Самае галоўнае — усё, што сёння робіцца ў краіне, накіравана на паляпшэнне якасці жыцця нашага народа, забеспячэнне міру і бяспекі нашай краіны».

**Валерыя СЦЯЦКО.**

# ЭКАНАМІЧНЫ СУД

## на завяршальным этапе

сістэме з'явіцца дадатковая ступень судовых інстанцый, і работа будзе будавацца па прынцыпе: адзін суд — адна інстанцыя.

**Кожнае звяно ў дадзенай сістэме будзе выконваць дакладна пэўную функцыю, што дазволіць аб'ектыўна і ўсебакова разглядзець скаргі ці прэтэнзіі.**

З увядзеннем апеляцыйнага суда ў фізічных і юрыдычных асоб з'явіцца магчымасць абскардзіць рашэнне эканамічных судоў як судоў першай інстанцыі.

Такім чынам, функцыі эканамічнага і апеляцыйнага суда разведзены, у тым ліку ў кожнай інстанцыі свае кадры і іншае месцазнаходжанне, што дасць магчымасць выбудаваць надзейную судовую абарону правоў і законных інтарэсаў грамадзян і юрыдычных асоб і павысіць якасць разгляду спрэчак. У большасці выпадкаў правасуддзе будзе завяршацца на апеляцыйнай стадыі».

Згодны з сенатарам і **старшыня эканамічнага суда Мінскай вобласці Аляксей САКОВІЧ** і прыводзіць прыклад з практыкі:



«Сёння ў эканамічных судах абласцей і горада Мінска суд апеляцыйнай інстанцыі знаходзіцца ў адным будынку з судом першай інстанцыі. У абедзвюх інстанцыях дзейнічае адзінае кіраўніцтва. Суддзі абедзвюх інстанцый прымаюць удзел у абагульненні і аналізе судовай практыкі, выпрацоўцы адзіных падыходаў у практыцы прымянення норм матэрыяльнага права. Фактычна адным судом прымаецца судовая пастанова, і ў выніку гэта судовая пастанова праходзіць стадыю апеляцыйнага абскарджвання».

Такая сітуацыя, па яго словах, зніжала жаданыя тэмпы павышэння ўзроўню якасці і эфектыўнасці правасуддзя, якое ажыццяўляецца судом першай інстанцыі.

У новай структуры, калі будзе дзейнічаць асобны незалежны апеляцыйны суд, як звярнуў увагу Аляксей Саковіч, павысіцца адказнасць суда першай інстанцыі за судовыя пастановы, якія прымаюцца. «У гэтай сувязі асноўнай задачай эканамічных судоў абласцей і горада Мінска з'яўляецца падрыхтоўка да работы ва ўмовах суда першай інстанцыі, — адзначыў ён. — Для гэтых мэт у судах прымаецца шэраг арганізацыйных мер, накіраваных на павышэнне якасці падрыхтоўкі спраў судовага разбіральніцтва, строгае выкананне норм працэсуальнага і матэрыяльнага права, усебаковае вывучэнне фактычных абставін па справе, прыняцце законнай і абгрунтаванай судовай пастановы. Найперш судовай пастановы, што будзе зразумелай асобам, якія звярнуліся ў суд па судовую абарону».

Старшыня эканамічнага суда Мінскай вобласці канстатаваў, што з 1 студзеня 2026 года разам з задачамі па ажыццяўленні правасуддзя на суды будуць ускладзены новыя задачы, не ўласцівыя ў цяперашні час для суда першай інстанцыі. «Гэта вырашэнне пытанняў аб прыняцці апеляцыйных скаргаў, накіраванне апеляцыйных скаргаў, іх матэрыялаў справы ў суд апеляцыйнай інстанцыі, — канкрэтызаваў ён. — У цяперашні час у судах актыўна праводзіцца работа па практычным вывучэнні палажэнняў Кодэкса грамадзянскага судаводства, ажыццяўляюцца мерапрыемствы, накіраваныя на падрыхтоўку да работы выключна як суда першай інстанцыі. На рэформу, якая праводзіцца, мы глядзім з аптымізмам. Упэўнены: усе пастаўленыя задачы будуць вырашаны».

**Сустаршыня праўлення, дырэктар Бізнес-саюза прадпрымальнікаў і наймальнікаў імя прафесара М. С. Куняўскага Жанна ТАРАСЕВІЧ** расказала аб чаканнях бізнес-супольнасці ад вынікаў судовай рэформы, яе важнасці для эканомікі. «Бізнес заўсёды вельмі трапятліва ставіцца да судовай сістэмы, — заўважыла яна. — Фактычна бізнес не можа існаваць без судовай сістэмы: узнікаюць шматлікага роду спрэчкі, якія патрабуюць разгляду на розных узроўнях. Больш за ўсё бізнес даверае судам, якія з'яўляюцца класічнай формай разгляду пэўных спрэчак».

Судовую рэформу прадстаўнікі бізнес-супольнасці ўспрымаюць як добры сігнал. «Нярэдка ў бізнесу ўзнікалі пэўныя сумненні, бо адзін і той жа суд разглядае спрэчку і тут жа разглядае апеляцыю, — патлумачыла Жанна Тарасевіч. — Цяпер з'яўляецца новая, абсалютна незалежная інстанцыя, дзе могуць разгледзець любыя апеляцыі. Бізнес будзе дакладна ўпэўнены ў тым, што рашэнне, якое прыняў суд, або тое рашэнне, якое вынесена апеляцыйным судом, будзе правільным. Рэформа выклікае больш давер да судовай сістэмы, дазваляе разлічваць на незалежную ацэнку».

**Вераніка КАНЮТА.**

# ДАТЫЧЫЦЦА КОЖНАГА



## «Для рэалізацыі амбіцыйных задач, вызначаных на пяцігодку»: эксперты — аб палажэннях Дырэктывы Прэзідэнта № 11

Дырэктыва № 11, якую Прэзідэнт падпісаў 2 красавіка, — бадай што, самая папулярная сёння тэма не толькі ва ўладных кабінетах, але, як кажуць, і ў народзе. Яе палажэнні закранаюць не толькі пытанні функцыянавання органаў улады і дзяржаўных арганізацый, але і выканальніцкую дысцыпліну, якая датычыцца літаральна ўсіх без выключэння. Як неаднойчы падкрэсліваў Прэзідэнт, менавіта ад яе, ад таго, наколькі адказна і якасна кожны на сваім месцы выконвае свае абавязкі, у многім залежыць і дабрабыт краіны ў цэлым, і яе суверэнітэт.

«Далейшае павышэнне якасці жыцця ў нашай краіне — гэта сумесная работа дзяржаўных органаў усіх узроўняў, арганізацый незалежна ад формы ўласнасці і грамадзян, — гаворыцца ва ўступнай частцы дакумента. — Добрасумленным, адказным, творчым стаўленнем да службовых абавязкаў, высокапрадукцыйным выкарыстаннем працоўнага часу кожны з нас робіць свой унёсак у агульны дабрабыт і ўстойлівасць краіны. Выканальніцкая дысцыпліна з'яўляецца адным з ключавых фактараў гатоўнасці дзяржаўных органаў і іншых арганізацый аператыўна і эфектыўна рэалізоўваць пастаўленыя задачы».

«Рэалізацыя пастаўленых на пяцігодку якасці задач па ўсебаковым пераўтварэнні дзяржавы і грамадства патрабуе кардынальнага павышэння эфектыўнасці функцыянавання сістэмы органаў дзяржаўнай улады, кіраўніцкай дзейнасці, узмацнення выканальніцкай дысцыпліны, сацыяльна адказных адносін кожнага да працы», — гаворыцца ў дырэктыве. Для гэтага дакументам прадугледжаны пэўныя меры і захады, якія варта разгледзець падрабязна.

*У прыватнасці, дырэктывай вызначана дзяржорганам і службовым асобам не дапускаць умяшанне ў кампетэнцыю іншых дзяржорганаў і службовых асоб, г. зн. акрэслены канкрэтныя функцыянал, які замацоўваецца за кожным з органаў дзяржкіравання.*

**Член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах Аляксандр ШПАКОЎСКІ** з гэтай нагоды ў эфіры «Альфа-Радыё» звярнуў увагу, што ў аснове любых паспяховых і эфектыўных кіраўніцкіх дзеянняў дзяржавы знаходзіцца, у першую чаргу, выканальніцкая дысцыпліна, субардынацыя, службовая этыка і гэтак далей.

— І разам з тым дысцыпліну не варта блытаць з арганізацыяй бясконцых праверак, нарад, розных кантрольных мерапрыемстваў з боку вышэйстаячых інстанцый, альбо перакрыжаванага кантролю. Гэта крыху іншае.

Наадварот, калі адбываецца празмернае нагнятанне аларміцкіх настрояў бясконцымі нарадамі, працоўнымі групамі, лятучкамі і да т. п., гэта ўносіць у работу органаў дзяржаўнай улады непатрэбныя бязладдзе і хаос, растлумачыў Аляксандр Шпакоўскі:

— У сувязі з гэтым кіраўнік дзяржавы Дырэктывай № 11 імкнецца дабіцца павышэння якасці эфектыўнасці дзяржаўнага кіравання ў нашай краіне, што будзе садзейнічаць рэалізацыі тых амбіцыйных задач, якія вызначаны на найбліжэйшую пяцігодку.

Акрамя таго, Аляксандр Шпакоўскі падкрэсліў, што падобнага роду дырэктыўныя дакументы не нараджаюцца на пустым месцы:

— Яны нараджаюцца на аснове раней атрыманай і старанна прааналізаванай інфармацыі. У пэўных ведамствах, арганізацыях, у тым ліку на месцах, крыху перабіраюць з бюракратыяй.

Ён нагадаў пра існаванне яшчэ адной дырэктывы Прэзідэнта аб дэбюракратызацыі дзяржаўнага апарату, якая не заўсёды выконваецца ў поўнай меры:

— А часам, наадварот, колькасць разнастайных бюракратычных «рагатак» у працэсе дзяржаўнага кіравання вырасла ў параўнанні з ранейшымі гадамі. У гэтай сувязі, відома, неабходна навядзенне парадку. Калі мы ўпарадкуем сістэму прыняцця рашэнняў, дзяржаўнага кіравання, пазбавім дзяржслужачых ад неўласцівых ім функцый і перавядзём усе гэтыя працэдуры ў больш аператыўны рэжым, гэта не значыць, што мы адмаўляемся ад дадзеных інструментаў. Таму мы імкнёмся знізіць колькасць падобных сустрэч. Такі падыход уяўляецца правільным і адаб'ецца вельмі спрыяльна на дзяржаўным кіраванні.

Дырэктывай вызначана, што адной з галоўных задач аптымізацыі кіраўніцкай дзейнасці з'яўляецца выключэнне неабгрунтаванага правядзення нарад, у тым ліку ў дыстанцыйным фармаце; спыненне фарміравання і функцыянавання саветаў, камісій, груп, іншых структур, акрамя непасрэдна прадугледжаных заканадаўчымі актамі.

**Старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце Валянцін СЕМЯНЯКА** адзначыў з гэтай нагоды, што ёсць рознага кшталту камісіі, сам факт стварэння якіх даволі сумнеўны:

— За формай не заўсёды стаіць змест, таму ад тых камісій, якія не адпавядаюць па сваёй форме зместу, трэба адмовіцца. У бытнасць намеснікам старшыні райвыканкама я ўзначальваў каля 17 такіх камісій. Калі нават па адной на месяц праводзіць, то гэта атрымліваецца практычна праз дзень, а то і кожны дзень.

На думку парламентарыя, асноўны сэнс гэтага рашэння заключаецца ў тым, каб павысіць персанальную адказнасць кіраўнікоў дзяржаўных органаў, кіраўнікоў структурных падраздзяленняў:

— І не трэба прыкрывацца гэтай калектыўнай адказнасцю.

*Дырэктывай таксама вызначаецца дасягненне нулявой бюракратыі адной са стратэгічных задач усёй сістэмы дзяржаўнай улады.*

**Аналітык аддзялення БІСД па Брэсцкай вобласці Сяргей ЖУК** адзначае:

— Дзяржавай узяты высокі тэмп выканання абяцанняў, зафіксаваных у перадвыбарнай праграме Прэзідэнта. Прыняцце дырэктывы накіравана на забеспячэнне нулявой бюракратыі ў Беларусі. Павышэнне якасці дзяржаўнага кіравання — адказ на выклікі свету, які ўсё больш паскараецца, фарміраванне новых пагроз.

Ён перакананы, што хуткае, узважанае і эфектыўнае прыняцце рашэнняў, якаснае іх выкананне, стварэнне ўмоў для паспяховай камунікацыі стане важным фактарам павышэння якасці жыцця грамадства і ўзмацнення эканамічнага патэнцыялу.

Па словах аналітыка, лічбавізацыя дзейнасці дзяржаўных органаў дазволіць павысіць якасць кіраўніцкіх рашэнняў. Такі падыход таксама адкрые магчымасці стварэння актуальнай для сучаснага грамадства (перш за ўсё для маладога пакалення) так званай дзяржавы ў тэлефоне.

— Інфарматызацыі і дыджыталізацыі ўзаемадзеяння органаў улады і арганізацый будзе садзейнічаць укараненне адзінай інфармацыйнай сістэмы аператыўнай і ведамаснай справаздачнасці, — лічыць эксперт.

Сяргей Жук вылучыў яшчэ адзін акцэнт дырэктывы:

*Стварающа ўмовы для павышэння якасці кіравання на месцах па формуле «больш магчымасцяў — вышэйшая адказнасць».*

— У гэтых адносінах дакумент развівае палажэнні прынятага ў лютым указа «Аб узмацненні ролі старшыняў выканаўчых камітэтаў базавага ўзроўню». Павышэнне працоўнай і выканальніцкай дысцыпліны — няўхільнае патрабаванне кіраўніка дзяржавы. І яе ўмацаванне, асабліва ў пяцігодку якасці, вельмі важна для функцыянавання сістэмы дзяржаўнай улады. Ініцыятыва, адказнасць, інфарматызацыя — асноўныя акцэнты шляху развіцця беларускай сістэмы дзяржаўнага кіравання, — падсумаваў аналітык.

*У сферы выканальніцкай дысцыпліны, мабыць, варта адзначыць задачы, якія вызначаны ў дырэктыве як прыярытэтныя для дзяржавы. І тут на першым радку тое, на што не раз звяртаў увагу Прэзідэнт, — забеспячэнне паўнавартаснага ўдзелу ўсіх працаздольных грамадзян у эканоміцы краіны. Следам ідуць дасягненне высокага ўзроўню выканальніцкай дысцыпліны; выхаванне культуры адказнасці кожнага за рашэнні, якія прымаюцца, і якасць працы; выхаванне моладзі ў духу патрыятызму і стымуляванне патэнцыялу моладзі ў інтарэсах беларускага грамадства.*

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах, старшыня праўлення ААБ «Беларусбанк» Віктар АНАНІЧ** выказаў упэўненасць, што дысцыпліна — найважнейшы складнік не толькі эфектыўнай работы любога прадпрыемства, але і залог іміджу і рэпутацыі:

— Гэту думку пастаянна даношу да калектываў установ банка па ўсёй краіне. Для фінансавага сектара асабліва важна, каб усе бізнес-працэсы працавалі як надзейны гадзіннік. Плацяжы павінны апрацоўвацца максімальна аператыўна, рэакцыя на ашуканскія дзеянні таксама павінна быць імгненнай. І гэта ўсё магчыма толькі ў тым выпадку, калі работнікі своечасова прыходзяць на працу, выконваюць рэгламентныя перапынкі, адказна вырашаюць задачы кожны на сваім участку.

Ён падкрэсліў: дысцыпліна ў плане супрацьдзеяння карупцыі, выдавання камерцыйнай тайны, персанальных даных важная з пункту гледжання рэпутацыі.

— На прыкладзе «Беларусбанка» магу сказаць: калі кіраўнікі ўсіх узроўняў будуць трансліраваць сваім калектывам важнасць падтрымання дысцыпліны ва ўсіх яе праявах, а яшчэ лепш пацвярджаць усё асабістым прыкладам, прадпрыемства будзе паспяховым і эфектыўным, а прадукцыя, якая выпускаецца, ці паслугі, якія аказваюцца, — якаснымі.

Улічваючы, як сур'ёзна ставіцца да пытанняў дысцыпліны лідар дзяржавы, транслюючы важнасць яе выканання на ўсіх узроўнях, кожнаму кіраўніку важна выхоўваць у сваіх калектывах карпаратыўную культуру, падмуркам якой якраз і павінна стаць дысцыпліна, — акцэнтаваў увагу сенатар.

*Забеспячэнне інфармацыйнай бяспекі як адно з найважнейшых патрабаванняў выканальніцкай дысцыпліны вынесена ў дырэктыве ў асобны пункт.*

І гэта невыпадкова: у сучасным тэхналагічным свеце менавіта інфармацыя з'яўляецца і самым дарагім таварам, і самай магутнай зброяй. І патрабаванне захоўваць інфармацыйную бяспеку датычыцца не толькі дзяржорганаў, але і кожнага з нас. Нават проста адкрыўшы на рабочым камп'ютары невядомае пісьмо або файл, можна нанесці значны ўрон свайму прадпрыемству і не толькі. Не кажучы ўжо пра распаўсюджванне неасабістай інфармацыі ў сацыяльных сетках.

*Кіраўнікоў дзяржаўных органаў і іншых арганізацый дырэктыва абавязвае ў падначаленых суб'ектах стварыць умовы недапушчальнасці і нецярпімасці парушэнняў выканальніцкай дысцыпліны ва ўзначаленым дзяржаўным органе (арганізацыі); павысіць патрабавальнасць да парушальнікаў выканальніцкай дысцыпліны, укараняць аўтаматызаваныя або іншыя сістэмы ўліку працоўнага часу, забяспечваць кантроль за эфектыўнасцю вынікаў працы.*

*Таксама кіраўнікам дырэктывай прадпісана стымуляваць захаванне і замацаванне высокакваліфікаваных кадраў, укараняць дзейсныя сістэмы матывацыі і заахвочвання эфектыўнай работы і прафесійнага развіцця супрацоўнікаў, паляпшаць умовы працы; прыняць вычарпальныя меры па выкананні фінансавай дысцыпліны, эфектыўным выкарыстанні дзяржаўных сродкаў, мэтавым і беражлівым распараджэнні дзяржаўнай маёмасцю, яе выкарыстанні.*

*З поўным тэкстам Дырэктывы № 11 «Аб удасканаленні функцыянавання сістэмы органаў улады і кіравання, узмацненні выканальніцкай дысцыпліны» можна азнаёміцца на нашым сайце zviazda.by.*

ПАРЛАМЕНЦКІ ДЗЁННІК

# БЕСПРЭЦЭДЭНТНАСЦЬ ПОДЗВІГУ БЕЛАРУСАЎ

## Другія парламенцкія чытанні прайшлі ў Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны

Іх тэма — «Партызанскі рух і падпольная барацьба ў Беларусі: гераізм і стойкасць народа ў імя Перамогі». Даклады, заслуханыя падчас чытанняў, расказваюць аб асаблівасцях падпольнай работы на Міншчыне, сведчаць аб подзвігу народных мсціўцаў на тэрыторыі Гомельскай вобласці, знаёмяць з гераічнымі ўчынкамі юных падпольшчыкаў, якія заплацілі за Перамогу самым каштоўным — уласным жыццём. Сімвалічна, што пра гэта даведаліся і навучэнцы Ліцэя імя Ф. Э. Дзяржынскага Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, якія разам з парламентарыямі прысутнічалі на чытаннях. Найперш усе ўдзельнікі парламенцкіх чытанняў азнаёміліся з унікальнай музейнай экспазіцыяй.



Як адзначыў **Старшыня Палаты прадстаўнікоў Ігар СЕРГЯЕНКА**, тэма другіх парламенцкіх чытанняў выбрана невыпадкова. Ен акцэнтаваў увагу на тым, што партызанскі рух і падпольная барацьба ў Беларусі — гэта дзве неразрыўныя часткі магутнага руху супраціўлення на тэрыторыі нашай краіны.

«Вы ведаеце з гісторыі, што шмат кажуць аб руху супраціўлення ў Заходняй Еўропе (у Францыі, Югаславіі), але па тым размаху і каардынацыі гэтай дзейнасці аналагаў у сусветнай гісторыі партызанскі рух і падпольная работа ў Беларусі не маюць, — падкрэсліў спікер. — Літаральна з першых дзён Вялікай Айчыннай вайны былі створаны першыя партызанскія атрады. Кожнаму школьніку вядомы прозвішчы Бумажкова, Паўлоўскага, пасёлак Акцябрскі на Гомельшчыне, дзе быў створаны першы партызанскі атрад. Такі ж атрад быў створаны на пяты дзень вайны пад камандаваннем Васіля Захаравіча Каржа на Піншчыне. Прыкладна ў гэты ж час на Віцебшчыне дзейнічаў легендарны бацька Мінай (Мінай Піліпавіч Шмыроў). Літаральна ў самым пачатку Вялікай Айчыннай вайны без усялякай каманды ствараліся невялікія партызанскія атрады, якія раслі».

Па словах Старшыні Палаты прадстаўнікоў, усё гэта было заканамерна. «Падрыхтоўчая работа з улікам Другой сусветнай вайны, якая набліжалася, вядома ж, праводзілася, — канстатаваў ён. — Вылучаліся людзі, якія разумелі, што застануцца на акупаванай тэрыторыі (і партыйныя супрацоўнікі, і работнікі органаў дзяржбяспекі), рыхтаваліся базы. Гэта і паслужыла асновай для стварэння партызанскіх атрадаў. У далейшым яны папаўняліся акружэнцамі, мясцовымі жыхарамі, закідваліся дзясяткі-сотні дыверсійных атрадаў і груп па лініі НКДБ. Па даных статыстыкі, на тэрыторыі Беларусі дзейнічалі 374 тысячы партызан, 70 тысяч складала падполле, рэзервы 400 тысяч. Я ўжо не кажу аб той дапамозе, якая аказвалася насельніцтвам, жанчынамі, якія пяклі партызанам хлеб, выходжвалі параненых, здабывалі і перадавалі партызанам звесткі».

Асаблівасцю партызанскага руху на тэрыторыі Беларусі, па словах Ігара Сергяенкі, стала каардынацыя дзеянняў партызан. «Быў створаны штаб партызанскага руху пад кіраўніцтвам Панамарэнкі, затым беларускі штаб у верасні 1942 года — пад кіраўніцтвам Пятра Калініна, — канкрэтызаваў спікер. — Падтрымлівалася сувязь з Вялікай зямлёй. Для арганізацыі партызанскага руху быў зроблены максімум».

Старшыня Палаты прадстаўнікоў адзначыў, што кожны можа прывесці нямала прыкладаў гераізму і мужнасці падпольшчыкаў і партызан, многія камандзіры ўвайшлі ў гісторыю.

> **«Не менш важную місію партызаны і падпольшчыкі неслі і праводзячы агітацыйную работу, — канкрэтызаваў спікер. — 170 друкаваных выданняў выходзіла ў партызанскіх злучэннях. І ўсімі намі любімая «Звязда» падпольна выдавалася на працягу ўсёй вайны. Я ўжо не кажу аб тых баявых лістках, якія таксама выходзілі ў партызанскіх атрадах».**

У якасці прыкладу Ігар Сергяенка прадэманстраваў кніжнае выданне, у якім адлюстраваны старонкі дзённіка спецатрада НКДБ БССР «Баявы», які на працягу многіх гадоў захоўваўся ў архіве КДБ. «Пры дапамозе каляровых алоўкаў з гумарам высмейвалі выпівох, тых, хто пайшоў у разведку і не выставіў дазор, адзначалі найлепшых — усё гэта было, жыццё працягвалася», — кажучы аб змесце выдання, распавёў спікер.

З тэматычнымі дакладамі перад прысутнымі выступілі дакладчыкі — вучоныя Нацыянальнай акадэміі навук і дэпутаты. Аб асноўных тэзісах іх выступленняў раскажам у адным з наступных нумароў газеты.

Парламенцкія чытанні працягнуцца. Наступныя пройдуць у маі непасрэдна ў Палаце прадстаўнікоў і будуць прысвечаны пытанням завяршэння Вялікай Айчыннай вайны, разгрому нямецка-фашысцкіх войскаў, вызваленню Усходняй Еўропы, узяццю Берліна.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота БелТА.**

# «ГАРАНТЫІ І АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВЫ ДЗЯРЖАВЫ Ў АДНОСІНАХ ДА ГРАМАДЗЯН ВЫКОНВАЮЦЦА»

## У Мінгарвыканкаме прайшла сустрэча дэлегатаў Усебеларускага народнага сходу ад горада Мінска

Мяркуецца, што пасяджэнне Усебеларускага народнага сходу адбудзецца ў хуткім часе і будзе праходзіць два дні. Яно стане другім у новым канстытуцыйным статусе і восьмым у агульнай складанасці. У Мінгарвыканкаме адбылася першая сустрэча дэлегатаў VII УНС ад горада Мінска перад чарговым пасяджэннем. Яна праводзілася ў адпаведнасці з Законам «Аб Усебеларускім народным сходзе».

З дакладам на мерапрыемстве выступіў **член Прэзідыума УНС, рэктар БДУІР Вадзім БОГУШ.** Акрамя абмеркавання папярэдніх вынікаў завяршэння пяцігодкі яшчэ адзін важны этап, паводле яго слоў, — планаванне наступнага пяцігадовага перыяду. Гэта ўваходзіць у непасрэдную кампетэнцыю УНС.

«Мы знаходзімся на вельмі важным часовым этапе. Гаворачы пра ролю VII УНС, хацеў бы спыніцца на тым, што ён мае вялікае значэнне ў гісторыі суверэннай Беларусі. Нагадаю, што сход праходзіць у новым канстытуцыйным статусе. Пры гэтым, у адпаведнасці з абноўленым Асноўным Законам, УНС — найвышэйшы прадстаўнічы орган народаўладдзя Беларусі. У Канстытуцыі замацаваны пытанні, якія знаходзяцца ў выключнай кампетэнцыі УНС: ён валодае правам зацвярджаць асноўныя кірункі ўнутранай і знешняй палітыкі, ваенную дактрыну, канцэпцыю нацыянальнай бяспекі, зацвярджаць праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь, а таксама заслухоўваць прэм'ер-міністра аб выкананні праграм сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь», — нагадаў Вадзім Богуш.

2025-ы — апошні год пяцігодкі, а таксама час планавання наступнай. Дэлегатам УНС трэба будзе не толькі займаць актыўную пазіцыю, але і ўключацца ў вырашэнне задач, якія сёння стаяць перад краінай.

«У апошні год пяцігодкі можна адзначыць не толькі негатыўныя, але і пазітыўныя бакі. Нагадаю пра мэту, якая ставілася на пяцігодку, — забеспячэнне стабільнасці ў грамадстве, рост дабрабыту грамадзян, нарошчванне сацыяльнага капіталу, стварэнне камфортных умоў для жыцця, працы і самарэалізацыі чалавека. Можам канстатаваць, што, нягледзячы на геапалітычныя змены, змяненне эканамічных умоў, пазіцыянаванне нашай краіны на міжнароднай арэне, гарантыі і абавязацельствы дзяржавы ў адносінах да грамадзян выконваюцца. Забяспечаны рост рэальных грашовых даходаў насельніцтва, нізкі ўзровень фактычнага беспрацоўя, нарошчваюцца тэмпы экспарту тавараў і паслуг, выконваюцца тэмпы па будаўніцтве жылля, забяспечваецца макраэканамічная стабільнасць. Акрамя таго, выконваюцца сацыяльныя гарантыі: даступная і якасная адукацыя, высокатэхналагічная медыцына», — адзначыў спікер.

Ёсць і пытанні, якія патрабуюць дадатковай увагі. Сярод іх — нарошчванне інвестыцыйнай дзейнасці, развіццё высокатэхналагічных вытворчасцяў, задзейнічанне і развіццё навуковага і тэхналагічнага патэнцыялу. Найважнейшая задача — забеспячэнне дэмаграфічнай бяспекі: павышэнне нараджальнасці, павелічэнне працягласці жыцця, а таксама прадуманая міграцыйная палітыка.

Усе гэтыя пытанні будуць у зоне ўвагі дэлегатаў УНС, аб шляхах іх вырашэння будуць гаварыць на найбліжэйшым пасяджэнні.

**Яна ВАЛАСАЧ.**

## ГОДОВОЙ ОТЧЕТ за 2024 год

Полное наименование эмитента:

**Открытое акционерное общество «КОМПЛЕКТ»**

Местонахождение: 220030, г. Минск, ул. Энгельса, 34.
Телефон, факс (с междугородним) кодом: +375 (17) 379-63-48.
Адрес электронной почты: stroykomp@tut.by, info@komplekt.by.
Банковские реквизиты эмитента: р/с BY 53 BPSB 3012 1035 6601 8933 0000 в ОАО «Сбер Банк», код банка (BIC) BPSBBY2X, 220030, г. Минск, пр-т Независимости, 32А-1.
Адрес официального сайта в глобальной компьютерной сети Интернет (п. 14 формы 1): https://komplekt.by

**Информация об открытом акционерном обществе «КОМПЛЕКТ» и его деятельности по состоянию на 01 января 2025 года**

Сведения из п. 4-10, 13, 14 формы 1 «Информация об открытом акционерном обществе и его деятельности»

**4. Доля государства в уставном фонде**

| Вид собственности | Количество акций, шт. | Доля в уставном фонде, % |
|---|---|---|
| Доля государства в уставном фонде, всего | 214 638 | 91,7194 |
| Республиканская | | |
| Коммунальная – всего, в том числе: | 214 638 | 91,7194 |
| областная | | |
| районная | | |
| городская | 214 638 | 91,7194 |

| Показатель | Единица измерения | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| **5. Количество акционеров, всего** | лиц | 230 | 224 |
| в т.ч. юридических лиц<br>- из них нерезидентов | лиц | 2 | 2 |
| в т.ч. физических лиц<br>- из них нерезидентов | лиц | 230<br>2 | 224<br>2 |
| **6. Информация о дивидендах и акциях:** | | | |
| Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде | тыс. руб. | 5,16 | 21,01 |
| Фактически выплаченные дивиденды в данном отчетном периоде | тыс. руб. | 20,78 | 18,50 |
| Дивиденды, приходящиеся на одну простую (обыкновенную) акцию (включая налоги) | рублей | 0,022033 | 0,09 |
| Дивиденды, приходящиеся на одну привилегированную акцию (включая налоги) первого типа | рублей | | |
| Дивиденды, приходящиеся на одну привилегированную акцию (включая налоги) второго типа | | | |
| Дивиденды, фактически выплаченные на одну простую (обыкновенную) акцию (включая налоги) | рублей | 0,09 | 0,08 |
| Дивиденды, фактически выплаченные на одну привилегированную акцию (включая налоги) первого типа | рублей | | |
| Дивиденды, фактически выплаченные на одну привилегированную акцию (включая налоги) второго типа | | | |
| Период, за который выплачивались дивиденды | Месяц квартал год | 2023 | х |
| Дата (даты) принятия решений о выплате дивидендов | Число, месяц, год | 28.03.2024 | х |
| Срок (сроки) выплаты дивидендов | Число, месяц, год | 22.04.2024–31.05.2024 | х |
| Обеспеченность акции имуществом общества | руб. | 30,49 | 27,71 |
| Количество простых акций, находящихся на балансе общества | штук | 0 | 0 |
| **7. Отдельные финансовые результаты деятельности** | | | |
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | тысяч рублей | 12373 | 12124 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг, управленческие расходы; расходы на реализацию | тысяч рублей | 11809 | 11726 |
| Прибыль (убыток) до налогообложения – всего (прибыль (убыток) отчетного периода) в том числе: | тысяч рублей | 134 | 345 |
| прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг | тысяч рублей | 564 | 398 |
| прочие доходы и расходы по текущей деятельности | тысяч рублей | -443 | -451 |
| прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности | тысяч рублей | -2 | 398 |
| Налог на прибыль; изменение отложенных налоговых обязательств; прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода); прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода) | тысяч рублей | 86 | 115 |
| Чистая прибыль (убыток) | тысяч рублей | 47 | 229 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | тысяч рублей | 1896 | 1866 |
| Долгосрочная дебиторская задолженность | тысяч рублей | 0 | 0 |
| Долгосрочные обязательства | тысяч рублей | 0 | 0 |
| **8. Среднесписочная численность работающих** | человек | 88 | 92 |

**9. Основные виды продукции или виды деятельности**, по которым получено двадцать и более процентов выручки от реализации товаров, продукции, услуг: транспортная обработка грузов – 47 %, оптовая торговля строительными материалами – 23 %.

**10. Дата проведения годового общего собрания акционеров**, на котором утверждался годовой бухгалтерский баланс за отчетный 2024 год – 27.03.2025 г.

**АУДИТОРСКОЕ ЗАКЛЮЧЕНИЕ по бухгалтерской (финансовой) отчетности подготовлено 28.02.2025 г.**

Аудит проведен: ООО «Центр Сертифицированных Аудиторов», 220113, г. Минск, ул. Мележа, д. 1, пом. 1504, зарегистрировано в ЕГР 12.09.2016. Минский городской исполнительный комитет УНП 192703382. Регистрационный номер записи в реестре аудиторских организаций: 10087.

Аудиторское мнение: *«По нашему мнению, прилагаемая бухгалтерская отчетность достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение ОАО «КОМПЛЕКТ» по состоянию на 31.12.2024 г., финансовые результаты его деятельности и изменение его финансового положения, в том числе движение денежных средств за 2024 год в соответствии с законодательством Республики Беларусь».*

Дата и источник опубликования аудиторского заключения по бухгалтерской (финансовой) отчетности в полном объеме: *на «Едином информационном ресурсе рынка ценных бумаг» и на официальном сайте ОАО «КОМПЛЕКТ» до 30.04.2025.*

**13. С правилами корпоративного поведения ознакомлены.**

**14. Адрес официального сайта** Открытого акционерного общества «КОМПЛЕКТ» в глобальной компьютерной сети Интернет: www.komplekt.by.

Дата принятия решения общим собранием акционеров ОАО «КОМПЛЕКТ» о выплате дивидендов – 27.03.2025 г. Период выплаты дивидендов – с 20.04.2025 до 31.05.2025 г.

**Порядок выплаты дивидендов:**

- на долю г. Минска – путем перечисления в финансовый отдел администрации Ленинского района не позднее 22.04.2025 г.; физическим лицам не позднее 31.05.2024 г.: работникам ОАО «КОМПЛЕКТ», дивиденды за 2024 год будут выплачены по месту получения заработной платы; пенсионерам, бывшим работникам, прочим акционерам – путем зачисления на их текущие счета в ОАО «Сбер Банк», при отсутствии счета и при сумме дивидендов более 10 руб. почтовым переводом, остальным – при обращении, в кассе предприятия.

**Директор** **Д. А. Кандер**

**Главный бухгалтер** **С. Н. Шерневич**

УНП 100377927

НА КАНТРОЛІ

# СПАЖЫВЕЦКІ КОШЫК

## Што будзе з інфляцыяй? Урад скарэкціраваў існуючую сістэму рэгулявання цэн

Прэм'ер-міністр Аляксандр ТУРЧЫН днямі падпісаў пастанову Саўміна № 713 (6) «Аб сістэме рэгулявання цэн». Нагадаем, дакумент у першай рэдакцыі з'явіўся ў 2022 годзе як адказ на істотны рост інфляцыі ў краіне. З цягам часу ён перажываў змены, апошняя яго карэкціроўка адбылася 2 красавіка. Што змянілася?

У адпаведнасці з пастановай, зыходзячы з балансу інтарэсаў дзяржавы і ўдзельнікаў спажывецкага рынку, пералік тавараў, якія падлягаюць цэнаваму рэгуляванню, скарачаецца **з 331 да 211** пазіцый, паведамілі ў прэс-службе ўрада, адзначыўшы, што скарачэнне пераліку пры гэтым грунтавалася на неабходнасці падтрымання ўзроўню інфляцыі і выключэнні з цэнавага рэгулявання тавараў непаўсядзённага попыту або прэміум-класа.

Таксама для вытворцаў тавараў, цэны на якія рэгулююцца, усталёўваецца лімітавая норма рэнтабельнасці, пры выкарыстанні якой не патрабуецца ўзгаднення павышэння цэн з дзяржаўнымі органамі (тут асноўны прынцып вызначэння лімітавай нормы рэнтабельнасці — падтрымка вытворцаў).

Акрамя таго, заканадаўча замацоўваецца пералік выдаткаў, якія **забаронена** ўключаць у сабекошт, а яшчэ ўсталёўваецца **адзіная лімітавая надбаўка** на імпартаваную прадукцыю незалежна ад колькасці звёнаў у пастаўцы тавару ад мяжы да паліцы.

Акрамя гэтага, захоўваецца **цэнавая даступнасць** для насельніцтва бульбы, цыбулі, буракоў, морквы, капусты і яблыкаў (да 1 мая 2025 года на іх будуць дзейнічаць гранічныя максімальныя цэны, далей у розніцы будуць дзейнічаць гранічныя надбаўкі).

Як растлумачылі ва ўрадзе, прадугледжваюцца таксама іншыя карэкціроўкі. Напрыклад, перадача ад МАРГ камісіі па пытаннях дзяржаўнага рэгулявання цэнаўтварэння пры Савеце Міністраў правоў і паўнамоцтваў па адмене рашэнняў дзяржаўных органаў аб узгадненні павышэння адпускных цэн, а таксама падаўжэнне да канца 2025 года раней дзеючага механізму па тавараабменных аперацыях. Аблвыканкамы будуць весці правы зацвярджаць пералік аперацый і арганізацый, паміж якімі такія аперацыі дазволены.

У Саўміне дадалі, што выключаюцца з цэнавага рэгулявання тавары, якія рэалізоўваюцца рэзідэнтам Беларусі для наступнай пастаўкі на экспарт (пасля ўзгаднення такой здзелкі з адпаведным дзяржаўным органам); тавары, якія рэалізоўваюцца ў стэрыльнай зоне аэрапортаў.

— Асноўныя змены ўступаюць у сілу пасля афіцыйнага апублікавання пастановы, а нормы, якія датычацца скарачэння пераліку рэгуляваных тавараў і парадку цэнаўтварэння на тавары, што імпартуюцца, — з 15 красавіка 2025 года, — пракаментавалі ва ўрадзе.



Асноўныя навацыі больш падрабязна растлумачыў журналістам **першы намеснік міністра антыманапольнага рэгулявання і гандлю Іван ВЕЖНАВЕЦ.**

Паводле яго слоў, асноўныя змены накіраваны ў першую чаргу на падтрымку айчынных вытворцаў:

— Першае і самае галоўнае змяненне: для нашых айчынных вытворцаў дадзена магчымасць не ўзгадняць павышэнне цаны ў выпадку, калі яны ўжываюць норму рэнтабельнасці пры калькуляванні адпаведнай цаны. Гэта норма рэнтабельнасці вызначаецца вытворцамі самастойна, зыходзячы з фактычных даных, якія ў іх ёсць за перыяд з



2021 да 2024 года. Норма рэнтабельнасці вызначаецца як максімальнае значэнне рэнтабельнасці рэалізаванай прадукцыі за адзін з гадоў у гэты перыяд.

Ён дадаў: калі ў вытворцы ў гэты перыяд была адмоўная рэнтабельнасць, то цэны можна павысіць да бясстратнага ўзроўню:

— Такім чынам для вытворцаў устаноўлена магчымасць фарміраваць самастойна цэны і не звяртацца ў дзяржаўныя органы па іх павышэнне.

Першы намеснік міністра адзначыў, што таксама прадугледжаны змяненні па таварах, якія пастаўляюцца па імпарце:

— У прыватнасці, у нас усталявана адзіная надбаўка ў імпартны тавар. Яна будзе прымяняцца незалежна ад колькасці звёнаў. Па сутнасці, ад граніцы да паліцы ўжываецца адна надбаўка для ўсіх суб'ектаў, якія ўдзельнічаюць у ланцужку пастаўкі тавару.

Таксама **скарочаны** пералік рэгуляваных тавараў.

Па словах Івана Вежнаўца, глабальных скарачэнняў не адбылося:

— Пералік падкарэкціраваны, і ў першую чаргу выключаны тавары, якія не з'яўляюцца таварамі паўсядзённага попыту альбо знаходзяцца ў больш высокай цэнавай катэгорыі. Асноўныя тавары, што ўваходзяць у спажывецкі кошык і запатрабаваны ў насельніцтва, засталіся пад рэгуляваннем.

Пры гэтым ён адзначыў, што МАРГ працягне маніторыць дынаміку цэн на рынку і пры неабходнасці будзе прымаць меры для абароны інтарэсаў грамадзян.

Адказваючы на пытанне аб адмене дзяржрэгулявання цэн на так званы баршчовы набор, Іван Вежнавец растлумачыў:

— Выключана рэгуляванне лімітавымі цэнамі ў маі. Абумоўлена тым, што ў гэтым месяцы будзе паступаць агародніна новага ўраджаю (ранняя прадукцыя). Для таго каб рэгуляванне не стрымлівала паступленне гэтай прадукцыі (якая часта даражэйшая, таму што першая агародніна заўсёды мае больш высокую цану, у тым ліку з-за выдаткаў у іх вытворчасць), унесены такія змены ў пастанову.

Ацэньваючы ўздзеянне дакумента на ўзровень інфляцыі, першы намеснік міністра адзначыў:

— У 2025 годзе ў нас стаіць задача забяспечыць узровень інфляцыі ў памеры не больш за 5 %. У цяперашні час мы знаходзімся крыху вышэй устаноўленага графіка, які намі распрацаваны. Гэта абумоўлена фактарам планавых рашэнняў аб павышэнні цэн і тарыфаў, у прыватнасці тарыфаў на жыллёва-камунальныя паслугі, павышэнне цэн на падакцызныя тавары, што таксама звязана з акцызнай палітыкай, а таксама пэўнай сезоннай валацільнасцю на агародніну.

Ён дадаў, што пры карэкціроўцы сістэмы цэнавага рэгулявання гэта можа адбіцца на больш хуткіх тэмпах росту інфляцыі.

— Разам з тым мы разумеем і прымаем усе неабходныя меры для таго, каб забяспечыць цэнавую даступнасць тавараў для насельніцтва, — запэўніў спікер.

Што да долі тавараў і паслуг, якія працягваюць заставацца пад дзяржрэгуляваннем, Іван Вежнавец растлумачыў:

— Да ўнясення змяненняў у пастанову № 713, да скарачэння пераліку рэгуляваных тавараў гэтыя пазіцыі займалі ў спажывецкім кошыку 54 %. Калі ўлічваць іншыя пазіцыі, якія рэгулююцца дзяржавай, але не рэгулююцца 713-й пастановай, гэта тарыфы ЖКГ, падакцызныя тавары, транспарт, то раней рэгулявалася 80 % спажывецкага кошыка.

Паводле яго слоў, у цяперашні час пры скарачэнні пераліку тавараў, рэгуляваных 713-й пастановай, гэта будзе займаць каля 30 % спажывецкага кошыка. А з улікам усіх іншых паслуг, якія рэгулююцца дзяржавай, гэта будзе больш за палову спажывецкага кошыка.

Што датычыцца далейшай перспектывы ўдасканалення сістэмы рэгулявання цэн, спецыяліст адзначыў:

— Мяркую, у перспектыве сістэма цэнавага рэгулявання будзе дынамічнай. Але ў цяперашні час папрацуем з прапанаваным механізмам, паглядзім, як ён адаб'ецца на цэнах на паліцы, на эканоміцы ў прадпрыемстваў. Пасля праведзення аналізу эфектыўнасці ўжо прынятых рашэнняў будуць далейшыя дзеянні.

# ЛІКВІДАВАЦЬ ХАТНІ «ПАЛІГОН»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Генеральны дырэктар патлумачыла, што пасля заварвання смецеправода пад'езд змяняецца: знікаюць лішнія непрыемныя пахі, становіцца чысцей. Тым не менш не ўсе жыхары гатовы выходзіць на вуліцу, каб вынесці смецце.

**У Мінску прынялі рашэнне ставіць сучасныя кантэйнерныя пляцоўкі модульнага тыпу ў крокавай даступнасці ад жылых дамоў. Дарэчы, сёлета ў сталіцы іх будзе больш за 700. Пасля ўстаноўкі пляцоўкі, калі людзі бачаць рэальны вынік, дыялог жыхароў і камунальнікаў, як правіла, наладжваецца. «Але галоўнае тое, што цяпер пры праектаванні новых дамоў смеццеправод не прадугледжваецца», — лічыць Марына Тоўсцік.**

## ЦЯПЛЕЙ І ТАННЕЙ

У Мінскай гарадской жыллёвай гаспадарцы растлумачылі, што «ліквідацыя» смеццепрыёмнікаў у пад'ездах працягваецца. Сёлета плануецца закансерваваць больш за 1,8 тысячы «стваловў». Такая мера з'яўляецца часткай нацыянальнай стратэгіі па абыходжанні з цвёрдымі камунальнымі адходамі і другаснымі матэрыяльнымі рэсурсамі. Аднак пра татальную «зачыстку» гаворкі не ідзе.

Па законе, каб павесіць замок на смеццепровад, дастаткова згоды на гэта паловы жыхароў пад'езда — калі ў апытальным лісце падпішацца 50 % жыхароў плюс 1 голас. Зрэшты, нават патрэбная колькасць ахвотных — гэта далёка не ўсё.

Без кантэйнернай пляцоўкі ў двары смеццеправод не закансервуюць. Акрамя таго, кантэйнеры для збору пластыкавага посуду, шкла, паперы і цвёрдых камунальных адходаў (ЦКА) павінны стаяць на цвёрдай аснове. Сама пляцоўка, абгароджаная металічным альбо бетонным плотам, павінна размяшчацца не бліжэй за 20 метраў ад дома, — а яшчэ знаходзіцца на адлегласці ад дзіцячай гульнявой зоны, ад устаноў адукацыі і аховы здароўя, аб'ектаў грамадскага харчавання. Калі адлегласць будзе меншай, то санітарныя службы могуць праект згарнуць. Плюс да ўсяго для ўладкавання пляцоўкі патрэбны праектная дакументацыя, узгадненне з архітэктарамі і МНС.

**У шматпавярховых дамах сталіцы функцыянуе больш за 7 тысяч смеццеправодаў. За мінулы год удалося закрыць каля 200.**

Таму, напэўна, работы расцягнуцца не на адзін год. У Мінскай гарадской жыллёвай гаспадарцы дадалі, што ёсць шэраг аргументаў на карысць закрыцця смеццеправодаў. Напрыклад, з часам канструкцыя пакрываецца брудам і становіцца ачагом хваробатворных бактэрый і мікробаў. З'яўляецца непрыемны пах, які трапляе ў тым ліку і ў кватэры. А пры няправільным выкарыстанні смеццеправод можа стаць крыніцай шуму або пажару.

Жыхары дамоў з смеццеправодам, як правіла, не сартуюць адходы, нават калі ў двары ёсць кантэйнеры для іх паасобнага збору. Немалаважна і тое, што праз смеццеправод сыходзіць цяпло з пад'езду і кватэр.

**Акрамя таго, жыхары дамоў з заваранымі смеццеправодамі або зусім без іх за паслугу «зварот з ЦКА» будуць плаціць на 20—30 % менш.**

Але варта прызнаць: спецыялісты камунальных службаў забіваюць такім чынам адразу двух зайцоў: зніжаюць сумы ў нашых жыроўках і наводзяць парадак на кантэйнернай пляцоўцы, а не ў ствале смеццеправода.

А каму яшчэ эканамічна выгадны дом без смеццеправода? Па логіцы — будучаму навасёлу, якому не прыйдзецца аплачваць лішнія квадратныя метры ў месцах агульнага карыстання. Або забудоўшчыку, які сэканоміць на будаўніцтве бетоннай скрыні.

## ГРАНДЫЁЗНАЯ МЫЙКА

Пра тое, ці трэба заварваць смеццеправоды, спрачаюцца дагэтуль. Адны лічаць іх рассаднікамі непрыемнага паху, грызуноў і шуму, іншыя прапануюць звярнуць увагу на стан некаторых кантэйнерных пляцовак каля пад'езда і ўсё ж пакінуць вынаходніцтва разумных інжынераў.

Галоўная парада ад жыхароў з вопытам: перш чым кансерваваць смеццеправод у пад'ездзе, яго варта старанна прамыць. Многія не разумеюць, што пры заварванні нячышчанага смеццеправода прусакі і пацукі адтуль нікуды не знікнуць. Ды і пах не выветрываецца. Уявіце, што зачынілі брудны пакой...

Для пачатку неабходна з суседзямі арганізаваць збор сродкаў, але перш правесці камунальны лікбез. Калі смеццеправод у гэтым пад'ездзе не заварваюць, яго чыстку будуць праводзіць цяпер часцей — магчыма, раз у год. Для гэтага трэба: абмеркаваць з жыхарамі пад'езда або дома неабходнасць апрацоўкі смеццеправода; знайсці фірму, якая займаецца чысткай; атрымаць згоду ад жыхароў пад'езда на аплату паслугі; прайсці ўзгадненне з усімі арганізацыямі і прапанаваць фірме памыць ствол смеццеправода, кішэні смеццепрыёмнай камеры і смеццякамеры і рабіць рэгулярныя апрацоўкі ад пацукоў і прусакоў.

Пасля гэтага трэба атрымаць узгадненне і дазвол уключыць паслугу чысткі ў жыроўку аднаразовай аплатай. Са свайго боку прадстаўнікі ЖЭУ павінны забяспечыць доступ ва ўсе памяшканні, іншымі словамі — прынесці ключы. У іх функцыі ўваходзіць і кантроль таго, як робяць апрацоўку ўсіх дапаможных памяшканняў і скляпоў.

Абраная кампанія не толькі пачысціць, але і закансервуе смеццеправод. Калі ў вашым пад'ездзе ёсць працаўнікі блакіравання, спецыялісты не раяць заварваць. Былі выпадкі, калі людзі вырашалі пытанне кулакамі, пратэстуючы супраць канчатковай кансервацыі.

## ШТО ТАРМОЗІЦЬ ПРАЦЭС?

Увесь цывілізаваны свет пазбаўляецца ад смеццеправодаў. І Беларусь пайшла па шляху іх заварвання. Як ставяцца да гэтага жыхары? Гэта своеасаблівы тэст, наколькі мы цывілізаваныя і прагрэсіўныя.

На жаль, яго праходзяць далёка не ўсе, успрымаючы ў штыкі ідэю ліквідацыі смеццевых шахт. Маўляў, зручна. А хіба складана, выходзячы ў краму ці на працу, захапіць з сабой пакет са смеццем, каб пакінуць яго на кантэйнернай пляцоўцы каля дома?

Можна колькі заўгодна спрачацца пра перавагі або недахопы ў дамах, абсталяваных смеццеправодамі. Але факт застаецца фактам: там, дзе іх няма, парадку больш, а з камунальных адходаў здабываецца больш другаснай сыравіны. І гэта, мабыць, самае галоўнае, да чаго мы павінны імкнуцца, — як мага менш адпраўляць адходаў на палігоны.

А пакуль у Міністэрстве жыллёва-камунальнай гаспадаркі запэўнілі, што заварваць усе смеццеправоды ў дамах на працягу 1—2 гадоў, калі так захочуць жыхары.

У нашай краіне ёсць гарады, дзе ўжо цалкам заварылі ўсе смеццеправоды, напрыклад, Гродна. У гэтым абласным цэнтры правялі апытанне насельніцтва, па выніках якога мясцовымі органамі ўлады было прынята адпаведнае рашэнне. Потым забяспечылі будаўніцтва кантэйнерных пляцовак. У Гомелі такса-ма гэтая работа практычна завершана.

**Сяргей КУРКАЧ.**



## ИЗВЕЩЕНИЕ
## о повторном открытом аукционе по продаже имущества ОАО по химической чистке одежды и стирке белья «Чайка» г. Гродно 22 апреля 2025 года

| | |
|---|---|
| Лот № 1 | Имущество, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 440100000002004541 по ул. Замковая, 4, площадью 0,1544 га (имущественное право земельного участка – право постоянного пользования):<br>**Капитальное строение с инвентарным номером 400/С-166001 по ул. Замковая, 4** (назначение: здание специализированное для бытового обслуживания населения, наименование: дом быта), площадью 6470 кв. м; составные части и принадлежности: технический подвал (А5/кп), технический этаж.<br>В здании сдаются в аренду помещения, часть входа и части крыши. С полным списком арендаторов и сроками договоров аренды можно ознакомиться на официальном сайте Организатора аукциона.<br>В соответствии с генеральным планом г. Гродно и детальным планом исторического центра г. Гродно с проектом регенерации исторической застройки, на территории участка ул. Замковая, 4 предполагается возведение (реконструкция) общественно-торгового объекта (группы объектов) с учётом сложившейся исторической пространственной среды и ограничений зон охраны историко-культурных ценностей<br>**Начальная цена продажи с понижением первоначальной на 60%: 4 047 360,00 рублей (с учетом НДС 20 %).**<br>Сумма задатка: 121 420,00 рублей |
| Продавец | **ОАО по химической чистке одежды и стирке белья «Чайка» г. Гродно, г. Гродно, ул. Зернова, 6, тел. 8 (152) 60-73-74** |

Организатор аукциона:
**Коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», г. Гродно, пл. Ленина, д. 2/1, тел.: 8 (152) 62-60-55, 62-60-56**

Дата и время проведения аукциона: **22 апреля 2025 года, 12.00**

Место проведения аукциона:
**г. Гродно, пл. Ленина, д. 2/1, актовый зал**

Место приема заявлений и прилагаемых к нему документов:
**г. Гродно, пл. Ленина, д. 2/1, кабинет № 117**

Дата и время начала приема документов:
**7 апреля 2025 года, 8.00;**
дата и время окончания приема документов:
**16 апреля 2025 года, 17.00**

При проведении торгов предусмотрен шаг аукциона 5 %.
По заявлению покупателя предоставляется рассрочка равными долями сроком до 12 месяцев. При условии предоставления рассрочки, покупателем оплачивается первоначальный взнос в течение 10 рабочих дней со дня заключения договора купли-продажи в размере не менее 30% стоимости продажи.
Условия продажи:
• Разработка и утверждение покупателем в течение одного года со дня заключения договора купли-продажи проектной документации на проведение модернизации или реконструкции здания с применением подходов, направленных на улучшение архитектурных и репрезентативных качеств фасадов здания с учётом размещения в историческом центре г. Гродно. В случае нарушения обязательства победитель торгов (покупатель) уплачивает продавцу штраф в размере 1000 базовых величин и за каждые последующие 6 месяцев нарушения обязательства – в размере 1000 базовых величин.
• Проведение покупателем модернизации или реконструкции здания и ввод его в эксплуатацию в сроки, установленные проектной документацией, но не позднее трёх лет со дня заключения договора купли-продажи. В случае нарушения обязательства победитель торгов (покупатель) уплачивает продавцу штраф в размере 1000 базовых величин и за каждые последующие 6 месяцев нарушения обязательства – в размере 1000 базовых величин.
• Обеспечение покупателем перехода всех обязательств по договору купли-продажи на нового собственника (в случае отчуждения имущества) в том объёме и на тех условиях, которые существовали к моменту приобретения имущества, до полного исполнения всех условий договора купли-продажи.
К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:
- копии платежных поручений об оплате задатка на расчетный счет BY24AKBB30120000418104000000, Гродненское областное управление № 400 ОАО АСБ «Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY2X, УНП 590727594, код назначения платежа 40901, получатель – коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости»;
**юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь** – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; **иностранным юридическим лицом** – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; **представителем юридического лица Республики Беларусь** – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); **представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь** - нотариально удостоверенная доверенность; **представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица** - доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия.
Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее, чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона. Торги в отношении предмета аукциона проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов по каждому предмету аукциона признается участник, предложивший наиболее высокую цену. В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене продажи, увеличенной на 5 процентов.
Срок заключения договора купли-продажи – в течение 20 дней после проведения торгов.
Оплата за объект производится по договорённости сторон.
Победитель обязан возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, в течение 3 рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона, а также выплатить организатору аукциона вознаграждение в размере 0,5 %.
Извещение опубликовано на сайтах: Государственного комитета по имуществу au.nca.by, Гродненского городского исполнительного комитета grodno.gov.by, коммунального унитарного предприятия по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости» gcn.by

**ООО «Реалконсалтинг» извещает о проведении открытого аукциона № 13/25**

**по продаже административного помещения в Минске**

Предмет аукциона:

**Лот № 1 – Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-692459, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Клары Цеткин, 18/4-2, площадь – 861,4 кв. м, назначение – административное помещение, наименование – административные, производственно-складские, подсобные помещение.**

Обременение: ипотека, аренда.
Начальная цена – 1 150 000 долларов США

Аукцион проводится **14.05.2025 с 10.00 до 16.00** в форме электронного аукциона на электронной торговой площадке «РЕАЛТОРГИ» по адресу: https://realtorgi.by/ (далее – ЭТП).
**Заявки на участие в аукционе принимаются по 12.05.2025 включительно до 17.00**

**Для участия в аукционе необходимо:**
1) внести задаток в размере 1000 белорусских рублей на расчетный счет продавца BY15OLMP30120000867000000933 в ОАО «Белгазпромбанк», БИК OLMPBY2X, получатель платежа – ООО «ПБ-Креатив», УНП 192446951, назначение платежа: «Задаток для участия в аукционе № 13/25».
2) пройти регистрацию на ЭТП и подать заявку на участие в аукционе с приложением документов, предусмотренных Регламентом ЭТП

Аукцион проводится в соответствии с Регламентом ЭТП (размещен по адресу: https://realtorgi.by/reglament-etp). Подавая заявку на участие в аукционе, участник аукциона принимает условия размещенного на странице лота (вкладка «Договор и документы») соглашения о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения электронного аукциона, устанавливающего права, обязанности и ответственность участника аукциона.
Победителем аукциона объявляется участник, предложивший наибольшую цену. Шаг аукциона: 5 процентов от начальной цены. В случае, если заявка на участие по лоту подана только одним участником (далее – единственный участник), лот продается этому участнику, с его согласия, по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.
Победитель аукциона (единственный участник, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 процентов) возмещает организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона в течение 3 рабочих дней со дня его проведения.
Срок подписания договора купли-продажи предмета аукциона – в течение 20 дней со дня проведения аукциона. Срок оплаты предмета аукциона по договору купли-продажи – в течение 30 дней со дня проведения аукциона, если стороны договора не договорятся об ином сроке.
Продажа предмета аукциона осуществляется по цене, сложившейся по результатам аукциона, в белорусских рублях, исходя из официального курса белорусского рубля по отношению к доллару США, установленного Национальным банком Республики Беларусь на дату оплаты предмета аукциона.
Победителю аукциона (единственному участнику, согласившемуся приобрести предмет аукциона по цене, увеличенной на 5 процентов) внесенный задаток учитывается в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи предмета аукциона, другим участникам задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона. Собственник имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до даты проведения аукциона, о чем Организатором аукциона извещаются участники аукциона.

**Организатор аукциона и оператор ЭТП:**
**ООО «Реалконсалтинг», УНП 191302068,**
**г. Минск, ул. Пономаренко, 35А, пом. 701, каб. 8,**
**тел.: +375 (17) 256 61 35; +375 (25) 549 86 22**
**• auction@expertiza.by, https://www.expertiza.by/**
**Продавец – ООО «ПБ-Креатив», УНП 192446951,**
**г. Минск, ул. Клары Цеткин, д. 18/4-2, ком. № 2**



**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА по продаже незавершенного незаконсервированного жилого дома и земельного участка в частную собственность гражданам Республики Беларусь**

**Организатор:** Октябрьский сельский исполнительный комитет Логойского района Минской области
**Дата, время и место проведения аукциона:**
**21 мая 2025 г. в 11.00**
по адресу: Логойский район, аг. Октябрь, ул. Центральная, д. 13, Октябрьский сельский исполнительный комитет,
конт. тел.: 8 (01774) 72 2 35, 72 2 36;
+375 (44) 547-67-56. Эл. адрес: oktyabr@logoysk.gov.by

| | |
|---|---|
| **Адрес объекта и его наименование** | **Не завершенный строительством незаконсервированный жилой дом, расположенный в деревне Посадец, ул. Центральная, 14А и земельный участок площадью 0,1852 га, с кадастровым номером 623281706101000045.** Целевое назначение земельного участка – для строительства и обслуживания жилого дома. Не завершенное строительством незаконсервированное капитальное строение: готовность 34 %, площадь застройки – 54 кв. м, фундамент – бетон, стены – блоки газосиликатные, физический износ – 15 % |
| **Инженерная инфраструктура** | Асфальтовая дорога, возможность подключения к электросетям и водопроводу |
| **Начальная цена** | 12 000,00 рублей |
| **Задаток** | 1 200,00 рублей (10 % от начальной цены) перечисляется ОАО «АСБ Беларусбанк», номер счета BY23AKBB36006191311020000000, код банка (BIK) AKBBBY2X, получатель ГУ МФ РБ по Минской области, УНП600537220, бенефициар – Октябрьский сельский исполнительный комитет, УНП600181656 |
| **Затраты на организацию и проведение аукциона** | Публикация в газете |

Приём заявлений и прилагаемых к ним документов, ознакомление с участком и документацией: ежедневно с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (кроме субботы и воскресенья) до 19.05.2025 включительно

Извещение о проведении повторного аукциона по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов размещено на сайтах:
1. Минского областного исполнительного комитета minsk-region.gov.by
2. Минского городского исполнительного комитета minsk.gov.by
3. Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь gki.gov.by
4. Логойского районного исполнительного комитета logoysk.gov.by


# ФІЗІКІ, ЛІРЫКІ АБО... МЭТАВІКІ?

## УМОВЫ РОЎНЫЯ І ПРАЗРЫСТЫЯ

— Уступная кампанія ў ВНУ праходзіць у адпаведнасці з правіламі прыёму, зацверджанымі Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 27 студзеня 2022 г. № 23, — тлумачыць **першы намеснік міністра адукацыі Аляксандр БАХАНОВІЧ.** — Усе падыходы па прыёме абітурыентаў, якія добра зарэкамендавалі сябе летась, захаваны.

Ён запэўніў, што, як і раней, будуць забяспечаны роўныя празрыстыя ўмовы і створаны ўсе неабходныя магчымасці для паступлення адораных, таленавітых і матываваных абітурыентаў на запатрабаваныя эканомікай нашай краіны спецыяльнасці. Пры тым што набор у ВНУ захоўваецца на ўзроўні мінулага года, план на бюджэтную форму павялічаны на 400 чалавек, і складае ў цэлым 31,8 тысячы абітурыентаў.

— Улічваючы колькасць выпускнікоў гэтага года, мы стварылі ўсе ўмовы для паступлення найбольш падрыхтаваных выпускнікоў у ВНУ, — канстатаваў першы намеснік міністра адукацыі. — Вельмі важна, што практычна кожны чацвёрты абітурыент — будучы інжынер.

Аляксандр Бахановіч таксама дадаў, што ў 2025 годзе для атрымання сярэдняй спецыяльнай адукацыі плануецца прыняць 38,6 тысячы чалавек, у тым ліку за кошт сродкаў бюджэту — 29,7 тысячы навучэнцаў, і прывёў наступны факт: «На платнай аснове ў каледжы плануецца прыняць 8,9 тысячы чалавек, у тым ліку на дзённую форму атрымання адукацыі — 6,2 тысячы, на завочную форму — 2,7 тысячы навучэнцаў, на вячэрнюю — 39, і на дыстанцыйную — 35 чалавек».

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Пры гэтым, як заўважыў прадстаўнік Мінадукацыі, набор за кошт сродкаў бюджэту ў 2025 годзе павялічыцца на 779 чалавек, а набор на платнай аснове скарацца на 1,3 тысячы чалавек.

У сістэму прафесійна-тэхнічнай адукацыі плануецца прыняць 28 тысяч чалавек — і гэта на 1,2 тысячы чалавек больш, чым у 2024-м. Пераважная большасць — 22,1 тысячы чалавек — выпускнікі 9 класа, выпускнікі з атэстатам складаюць 4,3 тысячы чалавек, са спецыяльнай адукацыяй — 428 чалавек.

— У найбліжэйшы час будуць апублікаваны тэрміны правядзення прыёмнай кампаніі, — сказаў Аляксандр Бахановіч. — Але ўжо сёння магу сказаць: яны будуць тыя ж, што і летась.

## ІНЖЫНЕРНЫЯ КЛАСЫ ІДУЦЬ «У БОЙ»

Адна з галоўных, цікавых і чаканых навацый уступнай кампаніі 2025 года — маштабны выпуск вучняў інжынерных класаў.

У Міністэрстве падкрэслілі, што тыя, хто мае па профільных прадметах бал не ніжэйшы за 8, а па ўсіх астатніх — не ніжэйшы за 7, змогуць паступіць у ВНУ Беларусі на шэраг запатрабаваных інжынерных спецыяльнасцяў без уступных выпрабаванняў.

— Стаць студэнтамі яны змогуць па сумоўі, якое пакажа ўзровень іх ведаў па праграме факультатыву «У свеце тэхнікі і тэхналогій: выбіраем інжынерную прафесію», — расказаў **начальнік Галоўнага ўпраўлення прафесійнай адукацыі міністэрства Сяргей ПІШЧОЎ.** — Ужо сёння пытанні, якія будуць прапанаваны на сумоўі, размешчаны на сайце Міністэрства адукацыі і на інфармацыйных рэсурсах ВНУ, якія будуць прымаць абітурыентаў па гэтай траекторыі.

Сяргей Пішчоў нагадаў, што акрамя вышэйпералічаных патрабаванняў такія абітурыенты павінны мець рэкамендацыю педагагічнага савета ўстановы адукацыі, якую яны скончылі.

## ЁСЦЬ «МЭТА» — МЕНШ ПЕРАШКОД

Па выніках прыёмнай кампаніі 2024 года на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі ва ўніверсітэты Беларусі залічана 4,6 тысячы чалавек, што на 1,1 тысячы больш, чым у 2023 годзе.

— Сёння Міністэрства адукацыі сумесна з зацікаўленымі арганізацыямі фарміруе план прыёму на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі, які будзе размешчаны на сайтах устаноў адукацыі да 1 мая, па педагагічных спецыяльнасцях — да 1 чэрвеня, — дзеліцца Аляксандр Бахановіч. — Дадзеная траекторыя паступлення карыстаецца павышанай цікавасцю ў абітурыентаў і арганізацый — заказчыкаў кадраў, і мы канстатуем штогадовы прырост такіх студэнтаў.

Разам з тым Аляксандр Генадзевіч адзначыў, што мэтавая падрыхтоўка — не самамэта.

— Мы разглядаем яе як механізм эфектыўнага ўзаемадзеяння ўстановы адукацыі з арганізацыяй — заказчыкам кадраў, павышэння якасці і практыка-арыентаванасці падрыхтоўкі спецыялістаў, арганізацыі персаніфікаванай траекторыі навучання. Акрамя таго, гэта індыкатыўны паказчык узроўню падрыхтоўкі і матывацыі будучага работніка, — канстатаваў ён.

Прыём абітурыентаў у ВНУ на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі ў 2025 годзе будзе праведзены з выкарыстаннем падыходаў, якія станоўча зарэкамендавалі сябе ў мінулыя гады. Гэта паступленне па конкурсе сярод асобных арганізацый-заказчыкаў, гэта ніжні парог сярэдняга бала дакумента аб адукацыі па шэрагу спецыяльнасцяў — не ніжэйшы за 7 (за выключэннем найбольш запатрабаваных эканомікай спецыяльнасцяў), гэта ўключэнне ў склад экзаменацыйных камісій выкладчыкаў ВНУ і настаўнікаў школ.

— Колькасць мэтавых месцаў у параўнанні з 2024 годам не змянілася і складае да 80 % для медыцынскіх спецыяльнасцяў, да 70 % — для сельскагаспадарчых, да 60 % — для астатніх, — прывёў даныя першы намеснік міністра.

Паводле яго слоў, для мэтавікоў застаўся ранейшым і фармат правядзення ўступнай кампаніі: прыём дакументаў у асобныя тэрміны, здача аднаго ўнутранага выпрабавання ва ўстановах вышэйшай адукацыі. Тэрміны прыёмнай кампаніі вызначаны наступныя: падача дакументаў — з 27 чэрвеня да 2 ліпеня, правядзенне ўступнага іспыту — з 4 да 10 ліпеня, залічэнне — да 12 ліпеня.

Змены не закранулі і пералік найбольш запатрабаваных эканомікай спецыяльнасцяў — усяго 69 пазіцый.

## НОВЫЯ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ: ПРАЕКТАВАННЕ БЕСПІЛОТНІКАЎ І ПАГЛЫБЛЕНАЕ ВЫВУЧЭННЕ КІТАЙСКАЙ

У 2025 годзе адкрыта падрыхтоўка па 10 новых спецыяльнасцях у сістэме вышэйшай адукацыі, 5 — сярэдняй спецыяльнай і па 4 кваліфікацыях — прафесійна-тэхнічнай адукацыі.




Упершыню на ўзроўні вышэйшай адукацыі будуць прымаць абітурыентаў на спецыяльнасці «Праектаванне і тэхналогія беспілотных авіяцыйных комплексаў», «Звышвысокачастотныя сістэмы», «Хімічная тэхналогія энергнасычаных матэрыялаў», «Фізічная культура. Ваенна-патрыятычнае выхаванне», «Афрыканістыка», «Харчовая бяспека», «Міжнародная эканоміка і гандаль (з паглыбленым вывучэннем кітайскай мовы)» і іншыя. У каледжах — «Кузаўны рамонт транспартных сродкаў», «Выхаваўчая работа», «Дызайн гукавога асяроддзя».

**Алена ВІНАГРАДАВА.**

СПЕЦЫЯЛЬНЫ РЭПАРТАЖ

# НА ПОЛІ ТАНКІ ГРУКАТАЛІ...

**Як праходзіць трэніроўка разлікаў механізаванай калоны да ваеннага парада**



Гул ваенных машын, пах бензіну, бясконцыя калоны тэхнікі — на тэрыторыі аэрадрома Ліпкі не тое, што шматлюдна, хутчэй, шматмашынна. Гэта ваеннаслужачыя Узброеных Сіл ва ўсю трэніруюцца якаснаму кіраванню тэхнікай. Яно і не дзіўна: ваенны парад 9 Мая павінен прайсці бездакорна, тым больш калі краіна адзначае 80-годдзе Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Ды і сам удзел у ваенным парадзе мае на ўвазе велізарную адказнасць, бо магчымасць далучыцца да цэнтральнай падзеі 9 Мая для любога ваеннаслужачага — велізарны гонар.







Фота Віктара ДРАЧОВА.

## 24 ПАРАДНЫЯ РАЗЛІКІ, ЗВЫШ 220 АДЗІНАК КОЛАВАЙ І ГУСЕНІЧНАЙ ТЭХНІКІ

Сярод узораў узбраення, ваеннай і спецыяльнай тэхнікі прадстаўлены самыя розныя пазіцыі. Гэта магутны аператыўна-тактычны ракетны комплекс «Іскандэр-М», які стаіць на ўзбраенні беларускай арміі, здольны паражаць цэлі на далёкасці да 500 кіламетраў і прымяняць ракеты не толькі ў звычайным, але і ядзерным абсталяванні; ракетная сістэма «Паланэз», здольная паражаць цэлі на адлегласці да 300 кіламетраў; зенітныя ракетныя комплексы вялікай і сярэдняй далёкасці С-400 «Трыумф» і многія іншыя; лёгкія бранірваныя аўтамабілі «Пікап», «Дракон», браніраваныя транспартныя сродкі «Кайман», бронеаўтамабілі «Тыгр-М».

Удзел у ваенным парадзе прыме больш за 220 адзінак сучаснай і мадэрнізаванай беларускімі прадпрыемствамі тэхнікі. Аб гэтым расказаў журналістам **намеснік камандуючага войскамі Паўночна-Заходняга аператыўнага камандавання генерал-маёр Ігар КАЗЛОЎ.** «У гістарычнай частцы механізаванай калоны будзе прымаць удзел ваенная тэхніка часоў Вялікай Айчыннай вайны. На чале гістарычнай каробкі па ўжо добрай традыцыі будзе ісці танк Т-34-85 «Чырвоны»». Рыхтавацца да такой важнай падзеі ваеннаслужачыя пачалі яшчэ ў сакавіку. З тых часоў і да самага свята яны будуць адточваць свае навыкі кіравання тэхнікай. «У цэлым, ваеннаслужачыя добра падрыхтаваны. Першапачаткова яны былі адабраны ў воінскіх часцях і падраздзяленнях для ўдзелу ў парадзе, затым прыбылі сюды для праходжання трэніровак і сёння паказваюць высокія рэзультаты», — адзначыў Ігар Казлоў.

Для таго каб такая разнастайная тэхніка ішла ў адным тэмпе, трэба прыкласці нямала намаганняў. Паводле слоў Ігара Казлова, для гэтага існуюць пэўныя ўмовы: «Па-першае, неабходна падтрымліваць пастаянную хуткасць — 17-18 кіламетраў за гадзіну. Па-другое, прытрымлівацца пэўнай дыстанцыі паміжараднымі разлікамі. Гэта дазваляе ваеннаслужачым трымаць лінію машын, і ў прынцыпе з гэтым у нас пакуль няма ніякіх складанасцяў».

## «У НАС НЯМА ПРАВА НА ПАМЫЛКУ»

Першым уараднай калоне пройдзе рэтраразлік. Сімвал Вялікай Айчыннай вайны — танк Т-34-85 «Чырвовы» — першы танк, які ўехаў у Мінск 3 ліпеня 1944 года. «Чырвоны» азначае пазыўны камандзіра танка Дзмітрыя Фролікава. Літара «Л» на ім — першая літара прозвішча камандзіра брыгады, які кіраваў вызваленнем Мінска, палкоўніка Лосіка. А лічба «145» — вежавы нумар танка. Танкі, выпушчаныя ў першай палове мінулага стагоддзя, ужо больш за 80 гадоў знаходзяцца ў эксплуатацыі. За імі патрэбен асаблівы догляд і дасканалы падыход да вузлоў, механізмаў і дэталяў. Больш падрабязна пра кіраванне такой тэхнікай расказаў **старшы параднага разліку рэтра падпалкоўнік Дзяніс ЗЕВАЛІЧ**: «Па-першае, мы адкрываем парад, па-другое, калі ты кіруеш сімвалам Вялікай Перамогі, вядома, адчуваеш пачуццё велізарнай адказнасці за тое, што менавіта табе выпаў гонар адкрываць парад і кіраваць гэтайараднай каробкай».

Спецыфіка кіравання рэтратэхнікай, прызнаецца Дзяніс Зеваліч, асаблівая: «Тэхніка не новая — часоў Вялікай Айчыннай вайны, але хачу падкрэсліць, што тады нашы дзяды і прадзеды зрабілі яе вельмі якаснай, зрабілі для чалавека, каб любы мужчына (а ў гісторыі былі такія выпадкі, што нават і жанчыны маглі сесці за рычагі і весці машыну) мог правільна яе эксплуатаваць і дамагацца выканання пастаўленых перад экіпажам задач».

**Кіроўца роты матэрыяльнага забеспячэння радавы Уладзіслаў САНЬКОЎ** паўдзельнічае ў ваенным парадзе ўпершыню. Ваеннаслужачы вучыцца кіраваць легендарнай «Кацюшай» на базе ЗІЛ-157: «У цэлым, кіраваць ёй няцяжка. У гэтым вельмі дапамагаюць рэгулярныя трэніроўкі, якія праводзяцца кожны аўторак, сераду і чацвер. Па пятніцах мы займаемся абслугоўваннем тэхнікі». Кіруючы легендарнай «Кацюшай», якая праявіла сябе падчас Вялікай Айчыннай вайны, Уладзіслаў Санькоў адчувае гонар і смеласць. А для якаснага і раўнамернага перамяшчэння, паводле яго слоў, неабходна кантраляваць хуткасць і раўняцца на таварышаў. Упартыя трэніроўкі і работа над сабой абавязкова дазволяць дамагчыся ідэалу, перакананы малады кіроўца.

**Старшы машыны «Тыгр-М» Павел** таксама расказаў пра сваю тэхніку: «Па-першае, гэта машына прызначана для спецыяльных падраздзяленняў. Аналагічная тэхніка была ўжо апрабавана ва Узброеных Сілах Расійскай Федэрацыі і зарэкамендавала сябе як надзейная. Яна выкарыстоўвалася ў розных вучэннях і аперацыях, уключаючы спецыяльную ваенную аперацыю».

У падрыхтоўцы да ваеннага парада ваеннаслужачы не бачыць ніякіх складанасцяў. «Самае галоўнае — гэта практыка, — упэўнены Павел. — Важна адчуць свайго калегу ў іншай машыне, зразумець, як мы будзем рухацца далей. У цэлым, на трэцім тыдні падрыхтоўкі асаблівых праблем няма, бо нездарма ж мы разам служым — навучыліся разумець адзін аднаго і ўжо гатовыя да парада на ўсе 100 %».

Малады чалавек удзельнічае ў ваенным парадзе ўпершыню. Ён расказаў, чаму для яго гэта так важна: «Мой прадзед пасля вызвалення заходняй часткі Беларусі ўступіў у шэрагі Чырвонай Арміі і дайшоў да Берліна, атрымаў медаль за ўзяцце горада. Ён быў кіроўцам студэбекера, перавозіў артылерыйскую гармату і біў агнём па варожай сталіцы. Я ім вельмі ганаруся, таму ў такую юбілейную дату хачу быць хоць бы датычным да яго подзвігу. Для мяне гэта дарагога варта».

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**


Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191 021 390, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. |
| **Продавец** | Унитарное предприятие «БелшинаТранс», Могилевская область, г. Бобруйск, Минское шоссе. УНП 790913853 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига 40, пом. 46, оф.1. Адрес ЭТП: www.ipmtorgi.by |

**Предмет электронных торгов**
Месторасположение: г. Бобруйск, ул. Минское шоссе (территория ОАО «Белшина»)

| № лота | Наименование | Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб. |
|---|---|---|
| 1 | **Грузовой седельный тягач MAZ-5440 18**, АА 8358-6, 2008 г. в. | **23 620,00** |
| 2 | **Грузовой седельный тягач MAZ-5440 19**, АА 8359-6, 2008 г. в. | **23 620,00** |
| 3 | **Грузовой седельный тягач MAZ-MAN 543268**, AI 4390-6, 2005 г. в. | **11 810,00** |
| 4 | **Экскаватор S-1203**, завод. № 54272, 1990 г. в. | **23 620,00** |
| 5 | **Погрузчик фронтальный (категория «F»)**, ТО-18Б, МБ 6317, 1993 г. в. | **23 620,00** |
| 6 | **Грузовой седельный тягач MAZ-544069 320-031,** AI 7879-6, 2008 г. в. | **35 050,00** |
| 7 | **Машина универсальная Беларус МУ-466**, IB-6 2049, 2012 г. в. | **177 361,96** |

***Шаг аукциона: 5 % от текущей цены***

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ» г. Минск, БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 15 (пятнадцать)** рабочих дней после проведения электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов:** в течение **30 (тридцати)** дней после заключения договора купли-продажи

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» (www.ipmtorgi.by). Победителем аукциона признаётся участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов, либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение **7 %** от цены продажи в течение **3 (трех) рабочих** дней после проведения электронных торгов

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» 19.03.2025

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 12.00 23.04.2025.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 22.04.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (44) 704-92-06.**
**E-mail: auction@cpo.by**



ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА
**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»**
(организатор аукциона)
по поручению **открытого акционерного общества «Рубежевичи»** (продавец)
проводит повторный открытый аукцион
по продаже имущества в составе:

**Лот № 1: здание одноквартирного жилого дома**
*(составные части и принадлежности: пристройка, сарай пристроенный, сарай, погреб, уборная),*
**общей площадью 75,5 кв. м, инв. № 622/С-29647, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 625482801101000012 (право постоянного пользования) площадью 0,0968 га, по адресу: Минская область, Столбцовский район, Литвенский с/с, д. Белановщина, 5.**
Начальная цена без НДС – **3 720,28** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **372,00** бел. руб.
**Стоимость снижена на 80 %.**

**Лот № 2: здание столовой**
